# СРОДКІ СТВАРЭННЯ КАМІЧНАГА Ў БАЛАДЗЕ «FINNEGANS' WAKE»

**З. С. Грэк**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Рэспубліка Беларусь,* bsu@bsu.by

У дакладзе разглядаюцца некаторыя прыёмы дасягнення камічнага эфекту ў ірландска-амерыканскай баладзе «Finnegans' Wake».

***Ключавыя словы:*** Ірландыя; ірландская балада; ірландская музыка; ірландская дыяспара; катэгорыя камічнага.

# СРЕДСТВА СОЗДАНИЯ КОМИЧЕСКОГО В БАЛЛАДЕ «FINNEGANS' WAKE»

**З. С. Грек**

*Белорусский государственный университет, Минск, Республика Беларусь,* bsu@bsu.by

В докладе рассматриваются некоторый приемы достижения комического эффекта в ирландско-американской балладе «Finnegans' Wake».

***Ключевые слова:*** Ирландия; ирландская баллада; ирдандская музыка; ирландская диаспора; категория комического.

Балада «Finnegans' Wake» была ўпершыню апублікавана ў 1864 годзе. Па паходжанні найбольш правільна было б аднесці яе да катэгорыі ірландска-амерыканскіх балад. Абазначэнне яе прыналежнасці менавіта такім чынам падаецца нам слушным праз тое, што ўжо на момант публікацыі ірландская дыяспара ў Злучаных Штатах Амерыкі дасягнула даволі значнага памеру. Толькі ў перыяд Вялікага Голаду 1845-1852 гг. колькасць імігрантаў ірландскага паходжання ў краіне павялічылася прыкладна на два мільёны чалавек [3]. Народныя балады, з'яўляючыся неад'емнай часткай аўдыяльнай культуры Ірландыі і не патрабуючы канкрэтных матэрыяльных складнікаў для далейшага распаўсюджання і выканання, маглі вандраваць разам з тымі, хто гатовы быў іх спяваць, граць і складаць. Так, гэтая музычная традыцыя не толькі змагла выжыць, але і атрымала далейшае развіццё. Балада, якую мы будзем разглядаць далей, з'яўляецца адным з самых шырока вядомых яе узораў.

У «Finnegans' Wake» распавядаецца пра Ціма Фінегана, чалавека, які любіў віскі і аднойчы праз яго сарваўся з лесвіцы, знаходзячыся ў нецвярозым стане. Яго лічаць мёртвым, па ім ладзяць памінкі. Падчас развітання завязваецца бойка, і на цела Фінегана раптоўна трапляе віскі, пасля чаго той цудоўным чынам вяртаецца да жыцця – на здзіўленне ўсім прысутным [1]. Пры праслухванні дадзенага твора з першых куплетаў адчуваецца вельмі моцны канфлікт формы са зместам: справа ў тым, што «Finnegans' Wake» традыцыйна выконваецца вельмі бадзёрым чынам, хоць гаворка ідзе і пра смерць – пра што тыя, для каго твор не ёсць знаёмым, думаюць да самай развязкі [2]. Канешне, ірландская балада будуецца на варыяцыі, і некаторыя выканаўцы могуць запаволіць музыку для таго, каб надаць больш увагі наратыву, аднак жа самае распаўсюджанае выкананне менавіта такое.

Акрамя відавочнага разрыву паміж тэмай і спосабам выканання варта звярнуць увагу на некаторыя дэталі сюжэту, з дапамогай якіх дасягаецца камічны эфект. Першая з іх – вяртанне Фінегана да жыцця. Ускосна менавіта віскі з'яўляецца прычынай смерці галоўнага героя, але ён уваскрасае (ці вяртаецца ў прытомны стан) таксама з яго ўдзелам:

With a love of the liquor now he was born.

(Ён нарадзіўся з цягай да выпіўкі).

The liquor scattered over Tim.

Tim revives! See how he rises!

(Выпіўка заліла цела Ціма.

Цім вяртаецца да жыцця! Гляньце, ён устае!)

Гратэск узмацняецца тым, што Цім нібыта піў з самага нараджэння. Яго «знаёмства» са спіртным, такім чынам, нібыта падвоенае: ён пачынае піць «з нараджэння» і з відавочным задавальненнем працягвае гэта пасля вяртання да жыцця. Пераносячы гэта на тыповы для асяроддзя, дзе з'явілася балада, светапогляд, атрымліваем цікавую прапорцыю: Фінеган піў і ў жыцці, і пасля смерці.

Таксама даволі значны кантраст паміж жыццём Фінегана, у якім не адбывалася нічога выбітнага і апісанне якога займае ў лепшым выпадку дзве страфы, і момантам памінак, калі адбываецца спрэчка, што пераходзіць у бойку. Такім чынам, падзеі як бы мяняюцца месцамі: звычайна жыццё чалавека чакаецца больш насычаным за пасмерце. Так рэалізаваная тут стандартная для балады структура, у якой адбываецца дынамічная змена дзеянняў, аднак яна пры ўсёй рэзкасці заўважна менш радыкальная.

Увесь сюжэт, як і большая частка камічных момантаў, будуецца тут на стэрэатыпе пра цягу ірландцаў да алкаголю. Як і большасць балад, напісаных ірландцамі пра саміх сябе, яна не гучыць злосна, хоць іронія ў

ёй досыць рэзкая. Гэта, на нашу думку, такі своеасаблівы ўзор сатыры, калі нейкая тэндэнцыя з'яўляецца прычынай для смеху, але не абавязкова мусіць быць выпраўленая [4].

Такім чынам, у баладзе «Finnegans' Wake» сумяшчаюцца іронія ў формах гратэску і алагізму і некаторыя элементы сатыры.

## Библиографический список

1. Irelandroots [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://irelandroots.com/finnegans-wake.htm. – Дата доступа: 09/10/2024.

2. Levy Music Collection [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://levysheetmusic.mse.jhu.edu/collection/052/003. – Дата доступа: 09.10.2024.

3. National Museum of Ireland [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.museum.ie/en-IE/Collections-Research/Folklife-Collections/Folklife-Collections-List-(1)/Other/Emigration/Irish-Emigration-to-America. – Дата доступа: 09.10.2024.

4. Steemit [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://steemit.com/finneganswake/@harlotscurse/finnegan-s-wake-origins#:~:text=Tim%20Finigan's%20Wake,only%20the%20lyrics%20are%20printed. – Дата доступа: 09.10.2024.